# МАЁ «АДКРЫЦЦЁ» ЮНРРА: АБ СТАНЕ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ТЭМАТЫКІ ЎЗАЕМААДНОСІН БССР З ЮНРРА Ў БЕЛАРУСІ І ЗАМЕЖЖЫ

***Снапкоўскі У. Е.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*e-mail: ulsnap44@inbox.ru*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

*Раскрыты асаблівасці і метады даследавання праблемы дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі ў 1945—1947 гг. Падкрэслены асабісты ўклад аўтара ў вывучэнні адпаведнай праблематыкі. Абазначаны праблемы, якія яшчэ належыць раскрыць пры далейшвм вывучэнні дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *БССР; ЮНРРА; метадалогія; крыніцы; архіўныя фонды; дакументы; гістарыяграфія.*

У савецкія часы ЮНРРА лічылася падазронай ці нелаяльнай да СССР міжнароднай арганізацыяй, дзе ЗША і іншыя заходнія дзяржавы праводзілі рэакцыйную палітыку, імкнучыся падпарадкаваць краіны-атрымальнікі дапамогі (дзве савецкія рэспублікі, блізкія да СССР дзяржавы Усходняй Еўропы — Польшчу, Чэхаславакію, Югаславію, Албанію, як і іншыя еўрапейскія краіны) свайму палітычнаму і эканамічнаму ўплыву. Такія ацэнкі змяшчаліся ў артыкуле пра ЮНРРА ў першым выданні савецкага «Дыпламатычнага слоўніку» (1948 г.) пад рэдакцыяй сумнавядомага пракурора і дыпламата А. Вышынскага. У наступных выданнях слоўніку (50—80-я гг. XX ст.) пад рэдакцыяй міністра замежных спраў СССР А.Грамыкі гэтыя ацэнкі захаваліся з пэўнай доляй змягчэння .

У савецкай гістарыяграфіі ЮНРРА не была спецыяльным прадметам даследавання. Паколькі гэта арганізацыя дзейнічала толькі на тэрыторыі Беларусі і Украіны, агульнасаюзныя навуковыя цэнтры ў Маскве яе не вывучалі, пакідаючы гэту рэспубліканскую тэму на водкуп украінскім і беларускім гісторыкам. На Украіне праблематыка міжнароднай і знешнепалітычнай дзейнасці УССР, як і іншых саюзных рэспублік, была найбольш распрацавана, а ўкраінскія гісторыкі і спецыялісты ў галіне міжнароднага права адрозніваліся больш смелымі навуковымі падыходамі і імкненнем да адрыцця новых тэм. Адной з такіх тэм стала пытанне аб дзейнасці ЮНРРА на Украіне, якое атрымала сваё адлюстраванне ў форме асобнага раздзела ў манаграфіі Л.Лешчанкі аб удзеле УССР у міжнародных адносінах у другой палове 1940-х гг. Паколькі характар адносін ЮНРРА з суседняй БССР быў шмат у чым падобны, то аўтар зразумела закранаў і беларускія сюжэты. Пасля Л. Лешчанкі юнраўская тэматыка пакрыху стала з’яўляцца на старонках абагульняючых прац украінскіх гісторыкаў. У БССР жа да самага канца савецкага перыяду гэта пытанне не знайшло свайго даследчыка. Аб гэтым аўтарам было сказана ў гістарыяграфічным аглядзе знешнепалітычнай дзейнасці БССР, зробленым у 1989 г.

Пасля таго як я выбраў тэмай сваёй доктарскай дысертацыі знешнепалітычную дзейнасць Беларускай ССР у 1944—1953 гг., адносіны па лініі БССР—ЮНРРА павінны былі знайсці ў ёй сваё належнае месца і яны гэта месца знайшлі. Праца над дысертацыяй у пачатку 1990-х гг. патрабавала новых падыходаў, перагляду старых трактовак і ацэнак, адкрыцця свежых тэм і забароненых іменаў, усяго таго, што атрымала назву «запаўнення белых плямаў у гістарыяграфіі». Адной

з такіх новых тэм, якія мне давялося адкрываць, з’явілася дзейнасць ЮНРРА ў Беларусі ў 1945—1947 гг. Да яе я падыходзіў паступова, чытаючы ў Маскве і Мінску працы ўкраінскіх і замежных, заходніх аўтараў, прытым апошнія знаходзіліся ў спецхранах бібліятэк. Так стала вядома пра дзейнасць ЮНРРА на Украіне і Беларусі, а потым і ўвогуле пра гісторыю гэтай арганізацыі дзякуючы фундаментальнай трохтомнай працы пад рэдакцыяй Д.Вудбрайджа, дзе змяшчаецца асобны раздзел пра адносіны Адміністрацыі з дзвюма савецкімі рэспублікамі. У 1947 г. ЮНРРА выдала працу супрацоўніцы гістарычнай секцыі ЮНРРА М. Рэдмер «Эканамічнае аднаўленне ў Беларусі», з якой азнаёміўся ў форме мікрафільма ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі, прысланага з Масквы.

Пасля вывучэння літаратуры прыйшоў час архіўных даследаванняў, якія былі праведзены ў Партыйным архіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Пазней, як вядома, ён быў перададзены ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. У фондзе ЦК КПБ былі прагледжаны матэрыялы бюро і сакратарыята ЦК і знойдзена некалькі пастаноў ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР па пытаннях супрацоўніцтва з ЮНРРА. Увогуле матэрыялаў па гэтай тэме ў фондзе ЦК КПБ я знайшоў мала з прычыны як недастатковa глыбокай прапрацоўкі гэтага вялізнага фонда, так і таго, што працэс рассякрэчвання толькі пачынаўся. У Навуковым архіве Інстытута расійскай гісторыі РАН было прагледжана дасье савецкай і замежнай прэсы па пытаннях міжнародных адносін, у тым ліку ўзаемаадносін СССР з ЮНРРА, і выяўлена шмат выразак з газет, асабліва англійскіх і амерыканскіх, па гэтай тэме. Толькі некаторыя з іх знайшлі адлюстраванне ў дысертацыі і пазнейшых публікацыях, што пакідае месца для далейшай працай над гэтай тэмай. Пасля рассякрэчвання фонда Управления ЮНРРА ў НАРБ з яго некалькімі вопісамі і 330 справамі ў даследчыкаў зараз з’явілася выдатная магчымасць глыбокага і шырокага вывучэння дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі, як і ў больш шырокім плане адносін СССР, УССР і БССР з гэтай арганізацыяй. Гэта магчымасць можа палепшыцца пры атрыманні доступу да Архіва МЗС Рэспублікі Беларусь (матэрыялаў сакратарыята, кантрольна-распараджальнай і справаздачнай дакументацыі), якія зараз не выдаюцца даследчыкам.

Яшчэ большыя перспектывы для архіўных пошукаў і знаходак адкрываюцца ў сталіцах замежных дзяржаў і Архіве ААН у Нью-Ёрку. У Маскве матэрыялы ЮНРРА знаходзяцца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (фонд Міністэрства знешняга гандлю СССР) і Архіве знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (фонд Аддзела міжнародных эканамічных арганізацый ). У Кіеве яны размеркаваны паміж Цэнтральным дзяржаўным архівам МЗС Украіны, Цэнтральным дзяржаўным архівам грамадскіх аб’яднанняў Украіны і Цэнтральным дзяржаўным архівам вышэйшых органаў улады і кіраўніцтва Украіны. У Лондане асобныя справы па ўзаемаадносінах СССР—ЮНРРА знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Вялікабрытаніі (фонд Форын Офіса), а аналітычныя матэрыялы па дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі і Украіне і іншыя афіцыйныя публікацыі ў бібліятэцы Лонданскай школы эканомікі і палітычных навук, паколькі Еўрапейскае рэгіянальнае бюро Адміністрацыі размяшчалася ў Лондане і яго матэрыялы пазней былі перададзены ў Архіў жаночай бібліятэкі (*The*

*Women's Library Archives*) гэтай установы. З матэрыяламі шэрагу названых вышэй архіваў у Маскве, Кіеве і Лондане аўтар працаваў на месцы.

Але самы вялікі масіў юнраўскіх матэрыялаў знаходзіцца ў Архіве ААН у Нью-Ёрку, куды быў перададзены ўвесь архіў ЮНРРА. Вывучэнне вопісаў гэтага архіва праз Інтэрнет паказвае, што там змяшчаецца каля двух соцен спраў па тэме «Беларусь—ЮНРРА». Гэта ў прыватнасці фонды Беларускай місіі ЮНРРА, бюро і штаб-кватэры Адміністрацыі, офіса гісторыкаў (Office of the historians) і інш. У Бібліятэцы Калумбіўскага ўніверсітэта (Butler Library) знаходзіцца рукапісны фонд першага кіраўніка місіі ЮНРРА ў Мінску Р.Скандрэта.

Паглядзім цяпер на тое, што зроблена ў беларускай гістарыяграфіі ў галіне даследаванняў юнраўскай тэматыкі. Як было адзначана, пачатак навуковага вывучэння гэтай праблемы адносіцца да першай паловы 1990-х гг. і звязаны ён з нашымі першымі публікацыцямі. Пазней у манаграфіі аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1944—1953 гг. асобны раздзел быў прысвечаны дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі. У пачатку 2000-х гг. артыкулы пра ЮНРРА з’явіліся ў беларускіх энцыклапедыях. У падручніках па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі гэта пытанне таксама прадстаўлена як важная частка міжнароднай дапамогі нашай рэспубліцы ў пасляваенныя гады. Асобныя артыкулы па юнраўскай ці блізкай да яе тэматыцы апублікаваныя Г. П. Бушчык, В. А. Вялікай, І. А Марцынкевіч, Ю. В. Кірчук.

На факультэце міжнародных адносін БДУ тэма «Дзейнасць ЮНРРА ў Беларусі» уваходзіць у спіс экзаменацыйных пытанняў па прадмету «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», а студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя працы па гэтай тэме . У 2017 г. вучаніцы 11-га класа сярэдняй школы № 130 г. Мінска імя Рут Уолер сталі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу вучняў за даследаванне «Миссия ООН—ЮНРРА в БССР (1946—1947 гг.)» .

У зборніках дакументаў, апублікаваных ў Беларусі ў пачатку XXI ст., упершыню былі ўключаны архіўныя і іншыя матэрыялы аб дзейнасці ЮНРРА ў рэспубліцы. І калі ў выданні «Освобождённая Беларусь» такіх дакументаў налічвалася толькі тры, то ў зборніку «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914—1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4 т. Т. 4 (4 ліпеня 1944 г. — 25 жніўня 1991 г.)» змешчаны 23 дакумента аб дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі ў 1945—1947 гг. з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі і Расіі і апублікаваных дакументаў знешняй палітыкі Вялікабрвытаніі, ЗША і СССР.

Падсумоўваючы пытанне аб стане даследаванняў дзейнасці ЮНРРА і яе адносін з Савецкім Саюзам, адзначым, што яно атрымала пэўнае адлюстраванне ў беларускай навуковай, вучэбнай і энцыклапедычнай літаратуры. У апошнія гады ўзрасла цікавасць дыпламатычных колаў да дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі. Аб гэтым сведчыць прысваенне імя Рут Уолер (супрацоўніцы місіі ЮНРРА, якая памерла ў Мінску) сярэдняй школе № 130 г. Мінска і адкрыццё памятнай дошкі аб дапамозе ААН у аднаўленні пасляваеннай Беларусі ў Лошыцкім усадзебным доме, дзе размяшчалася місія ЮНРРА.

Што датычыцца аўтарскага вопыту распрацоўкі гэтай тэмы, якую нам пашанцавала адкрываць, то да яе я ішоў праз вывучэнне англамоўнай, а потым украінскай літаратуры, пасля чаго прыйшоў час архіўнай працы,

чытання дакументаў і газет, перш за ўсё англійскіх і амерыканскіх, якія дастаткова шырока і падрабязна адлюстроўвалі дзейнасць ЮНРРА, у тым ліку ў Беларусі і Украіне. Гэта паказвае пэўны метадалагічны шлях, як адчыняць дзверы ў даследаванні новых тэм па гісторыі міжнародных адносін і знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі ў ХХ ст.

Маё адкрыццё ЮНРРА адбылося пасля прачытання ў спецхранах Масквы кніг па навейшай гісторыі Украіны на англійскай мове, дзе ўпершыню даведаўся пра дапамогу гэтай арганізацыі УССР і БССР. Далей па спасылках у гэтых кнігах выйшаў на трохтомную гісторыю ЮНРРА пад рэдакцыяй Д. Вудбрайджа, дзе даволі падрабязна выкладзена праца арганізацыі ў дзвюх савецкіх рэспубліках і змешчаны тэкст пагаднення Адміністрацыі з урадамі рэспублік. Потым ішло паглыбленне ў тэматыку і назапашванне канкрэтна-гістарычнага матэрыялу і нарэшце яго апрацоўка і напісанне тэксту. Наступны этап — апрабацыя вынікаў даследавання, публікацыя артыкулаў, выступленні на канферэнцыях. На маім вопыце можна заўважыць, што беларускія гісторыкі спазніліся з вывучэннем ЮНРРА ў параўнанні з украінскімі: кніга Л. Лешчанкі апублікавана ў 1969 г., а нашы першыя публікацыі выйшлі ў 1993—1994 гг. Аднак потым назіраецца ўзрастанне навуковай і грамадскай цікавасці ў Беларусі да гэтай тэмы, ЮНРРА прызнаецца беларускімі ўладамі як важная міжнародная арганізацыя дапамогі, якая садзейнічала эканамічнаму аднаўленню рэспублікі ў цяжкія пасляваенныя гады. Гэта адкрывае перспектывы далейшых даследаванняў тэмы «Беларусь—ЮНРРА» на падставе Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і замежных архіваў.

## К ВОПРОСУ ОБ АКТУАЛЬНОСТИ ИССЛЕДОВАНИЯ ВНЕШНЕЙ ПОЛИТИКИ МОНГОЛИИ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

***Степаненко Д. В., Турарбекова Р. М.,*** *Белорусский государственный университет,*
*e-mail: darya.stepanenko@gmail.com, turarbekova@tut.by*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

*Оцениваются основные результаты и значимость проведения исследований в области внешней политики Монголии в Республике Беларусь и Российской Федерации. Обращается внимание на неразработанность монгольского контента в белорусской историографии.*

***Ключевые слова:*** *Монголия; Республика Беларусь; Российская Федерация; историография; приоритет.*

Ранее монгольская тематика в белорусской историографии не рассматривалась, поскольку Монголия не включалась в число важных направлений внешней политики Республики Беларусь, несмотря на значительный интерес отечественных ученых к центральноазиатскому региону. В белорусской историографии отсутствуют как прикладные, так итеоретические научные работы по данной проблематике. Таким образом, новизна исследований внешней политики Монголии для белорусской историографии бесспорна.

В России, которая имеет с Монголией общую границу, проводятся исследования, раскрывающие особенности монгольской внешней политики. Среди них можно отметить в первую очередь работы видных российский востоковедов С. Г. Лузянина и А. С. Железнякова. За-